УДК 339.924 (476+470+571)

*М.Э. Часноўскі*

# АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ Ў ПАЧАТКУ XXI ст.

На працягу паўтара дзесяцігоддзя пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 г., якія азнаменавалі новы стыль кіравання, надзённыя беларускія знешнепалітычныя акцэнты фарміраваліся і змяняліся ў выглядзе геапалітычнага маятніка. У выгадны для Мінска момант ён схіляўся то на Усход (расійскі прыярытэт), то на Захад – у бок Еўрапейскага саюза (ЕС). Такая манеўранасць дазваляла дзяржаве захоўваць суверэнітэт і дасягаць сваіх інтарэсаў у эканоміцы і знешняй палітыцы. Транзітны геаграфічны стан Беларусі дапамагаў няспыннай працы маятніка, які так ці інакш «сілкаваўся» зацікаўленасцю большасці заходніх краін і партнёраў па еўразійскай прасторы ў зносінах з ёю. Адначасова для дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) Беларусь набыла статус узору ў працэсе шырокай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй. Змена інтэграцыйнай стратэгіі Расіі, якую стаў ажыццяўляць з пачатку 2000-х гг. новы яе лідар, паволі вяла да пэўнага абмежавання незалежнасці Рэспублікі Беларусь і самастойнасці беларускага кіраўніцтва ў правядзенні знешняй палітыкі. Адначасова ўзнікалі разнавіднасці беларуска-расійскай інтэграцыі ў двух- і шматбаковым фармаце як варыянты разнахуткаснай інтэграцыі на прасторы СНД.

## Эвалюцыя зместу беларуска-расійскай інтэграцыі

Праз увесь перыяд суверэннага развіцця больш важкія імпульсы беларускі геапалітычны маятнік атрымліваў ва ўсходнім пункце вагання. Яны былі расійскай платай за службу ў якасці ўзору такой інтэграцыі для постсавецкіх рэспублік, якую будаваў Крэмль. Значэнне згаданай інтэграцыі выразна ўзрасло з 2000-х гг., калі прэзідэнт У. Пуцін стаў мэтанакіравана аднаўляць уплыў у так званым блізкім замежжы.

Агульныя рысы гэтай стратэгіі складаліся яшчэ пры першым расійскім прэзідэнце Б. Ельцыне. Ён праводзіў лінію, сутнасць якой – за рэгіянальнае лідарства трэба плаціць. У імя такой мэты Крэмль падтрымліваў не толькі палітычнымі сродкамі, але і фінансава дружалюбных лідараў постсавецкіх краін. У. Пуцін у пасляельцынскай Расіі на працягу ўсіх гадоў фактычнага праўлення праводзіў прынцыпова іншую канцэптуальную лінію: уладарства Расіі на постсавецкай прасторы павінна ўзбагачаць рэсурс расійскай эканомікі, а не трымацца коштам яе выдаткаў. Згаданая лінія метафарычна ўвасобілася ў закліку У. Пуціна «аддзяліць мух ад катлет».

Зразумела, што афіцыйнаму Мінску стала на парадак складаней іграць ролю ўзорнага партнёра ў расійскіх інтэграцыйных схемах. У прыватнасці, няўмольна нарастала тэндэнцыя абмежавання самастойных знешніх крокаў беларускага кіраўніцтва з боку расійскіх цэнтраў уплыву.

Расійскае кіраўніцтва непакоілі крокі афіцыйнага Мінска насустрач Еўрапейскаму саюзу. Прыкладна з восені 2008 г. яны выліліся ў аднаўлены дыялог уладаў Беларусі з ЕС і планы ўдзелу ў палітыцы «Усходняга партнёрства», куды РБ была прынята ў канцы сакавіка 2009 г. Беларускае кіраўніцтва стрымана і выбіральна рэагавала на гэтую падзею. Акцэнт рабіўся выключна на значнасць толькі эканамічных адносін паміж Мінскам і Бруселем, на адмову ЕС ад дыскрымінацыі ў дадзеных адносінах. Беларусь настойліва шукала новыя нішы для развіцця сваёй эканомікі і магчымасці аслаблення ізаляцыйных сцэнарыяў Захаду. Масква ж падазравала, што для беларускіх кіраўнікоў пры збліжэнні з Еўрасаюзам палітычныя і іміджавыя дывідэнды важнейшыя за фінансава-эканамічныя.

На фоне пэўнага беларуска-заходнееўрапейскага збліжэння Масква ўгледзела праблему статуса заходняй беларускай мяжы. Па меркаванні Крамля, са з’яўленнем СНД

Беларусь аказалася стражам заходняй мяжы Садружнасці. Але з гадамі, уцягваючыся ў лімітрофную палітыку адносна Расіі, Мінск усё актыўней эксплуатаваў на міжнароднай арэне вобраз абаронцы межаў. У свядомасць расійскага істэблішмента нібыта ўбівалася паняцце Беларусі як новай Брэсцкай крэпасці, адбіваючай атакі НАТА. Пазней, з пачатку XXI ст., беларускае кіраўніцтва старалася сфарміраваць ужо ў Еўрасаюза вобраз краіны-шчыта супраць нелегальных мігрантаў, наркакур'ераў і нават тэрарыстаў, прыбываючых з усходу, г.зн. з Расіі. З 2009 г. актыўна развівалася тэма «Беларусь – фарпост заходняй цывілізацыі на ўсходзе Еўропы». Масква ж пераконвала, што добра фінансуемая праграма добраўпарадкавання знешніх межаў існуе ў рамках Саюзнай дзяржавы. На гэтыя сродкі, львіная доля якіх паступіла з расійскага бюджэту, на тэрыторыі Беларусі ўзведзены пагранічныя заставы і створаны пагранатрады. Аднак пытанне ўмацавання памежжа маецца і ў тэматыцы праграмы «Усходняе партнёрства». Таму расійскія аналітыкі з'едліва заяўлялі, што Мінск атрымаў унікальны шанс – утрымліваць і забудоўваць памежную структуру як коштам Расіі супраць НАТА і ЕС, так і коштам ЕС супраць Расіі.

Тут мы сведкі ацэнкі дзяржаўнай мяжы ў атавістычных катэгорыях халоднай вайны 2-й паловы XX ст. Зараз дзяржаўная мяжа не можа стаць сапраўдным шчытом пры вядзенні вайны сучаснымі сродкамі. Таму пытанне ніяк не атаясамліваецца з гандлем мяжой. Сучасная дзяржаўная мяжа – сапраўды адзін з нешматлікіх бар'ераў на шляху нелегальнай міграцыі, наркатрафіку і тэрарызму. Беларуская заходняя – у асаблівасці. У гэтым сэнсе яна карысная і для Захаду, і для Усходу.

Расійскія аналітыкі вынайшлі даволі фантастычную перасцярогу збліжэнню Беларусі з ЕС і НАТА. Яны сцвярджалі, што яно пагражае тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. У доказ заяўлялі, што беларускі шлях у структуры заходняй інтэграцыі ляжыць выключна праз Польшчу. Іншых варыянтаў няма. Менавіта Варшава стане патраніраваць Мінск. А гэта будзе патэнцыяльна весці да сур'ёзных унутрыпалітычных катаклізмаў і нават сепаратызму ў беларускім грамадстве. У расійскай інфармацыйнай прасторы сталі пануючымі сцвярджэнні, што Беларусь і Расія зацікаўленыя адна ў адной, аднак гэта зацікаўленасць несіметрычная і асінхронная. Маўляў, з гадамі залежнасць беларускай эканомікі ад расійскай расце, а ў яе экспарце пераважае прадукцыя з расійскай сыравіны і камплектуючых; расійскія субсідыі набылі крытычны ўплыў на беларускую эканоміку. У той жа час залежнасць Расіі ад Беларусі, уключаючы ваенна-палітычную і транзітную, ужо істотна знізілася або зыходзіць на нішто. Агульная запатрабаванасць Беларусі для Расіі падае, што абумоўлівае мэтазгоднасць зніжэння эканамічнай падтрымкі, а сама Беларусь не імкнецца генерыраваць такія задачы, якія б узмацнілі гэтую запатрабаванасць.

Насуперак рэальнасці адносна свабоды ўжывання рускай мовы і павагі да правоў рускіх у Беларусі, з пачатку XXI ст. неаднаразова ва ўльтыматыўнай форме гучалі перасцярогі з-за іх гіпатэтычнага парушэння. Разнастайныя расійскія цэнтры непакоіліся колькасным скарачэннем на трэць расійскай абшчыны па выніках перапісу 2009 г. Папракалі беларускія ўлады за іх нібыта павышаную падазронасць да рускіх і расіян, пражываючых у Беларусі. Сцвярджалася, што ідзе працэс беларусіфікацыі гэтых расіян і нават праводзяцца антырасійскія інфармацыйныя кампаніі па натраўліванні расійскай абшчыны на сваю гістарычную радзіму. Не прымаўся да ведама той перакане ўчы факт, што Беларусь уваходзіць у расійскую інфармацыйную прастору, а не наадварот.

Са сказанага вынікае, што з пачатку XXI ст. Расія паслядоўна змяняла мэту інтэграцыі з Беларуссю, менавіта імкнулася надаць Беларусі лімітрофную ролю, дзеля чаго стварала для свайго блізкага замежжа вобраз Беларусі, шчаслівай дзякуючы саюзу з Расіяй, і адначасова выкарыстоўвала яе як стратэгічнага партнёра і галоўную апору свайго ўплыву на захадзе постсавецкай прасторы. Варыянты самастойнай суверэннай знешняй палітыкі Мінска фактычна выключаліся. Таму расійскае кіраўніцтва пастаянна заяўляла аб гатоўнасці інтэгравацца ў розныя праекты: то ў Саюзную дзяржаву, то ў Мытны саюз,

то ў Адзіную эканамічную прастору. Жаданне ўтрымліваць Беларусь у сферы свайго ўплыву пабуджала Расію ўкладваць у гэта сур'ёзныя рэсурсы. Аднак рэальнасць была іншай, паколькі расійскія рашэнні рэалізаваліся не са стратэгічнага цэнтра, а пад уплывам розных груп інтарэсаў, кланаў уплыву. Яны мелі зусім іншы погляд на канкрэтныя эканамічныя рашэнні ў рамках узнікаючых сітуацый.

Паколькі такая інтэграцыйная стратэгія не спрацоўвала, то цэнтры расійскага геапалітычнага аналізу прапанавалі іншы падыход. Ён некалькі адрозніваўся і ад так званай «мяккай» сілы, і ад дэманстрацыі сілы як спосабаў навязвання саюзніцкіх адносін. Яго можна акрэсліць як «дэманстрацыя пераваг». Сутнасць новага падыходу ў наступным: заходні напрамак постсавецкай прасторы для Расіі больш значны, чым цэнтральна-азіяцкі або каўказскі. Таму дзейнічаць адносна больш значных расійскіх ускраін патрэбна больш цвёрда. У прыватнасці, не прэферэнцыямі і датацыямі, а дэманстрацыяй расійскіх пераваг над Украінай, Беларуссю і Малдовай, дзе, на думку расійскіх стратэгаў, імкліва расце разрыў у даходах радавых грамадзян адносна расіян і на фоне дэіндустрыялізацыі згаданых абшараў узрастае розніца ў прамысловым развіцці ў параўнанні з Расіяй. З-за гэтага індустрыяльнага разрыву большасці грамадзян постсавецкіх рэспублік стане цалкам няважна, дзе будзе цэнтр кіравання – у Кіеве, Мінску ці Маскве. Стратэгія прадбачвала зняцце любых датацый і пераход да жорсткіх рынкавых абмежаванняў, якія павінны хутка і эфектыўна «ацвярозіць» насельніцтва «заходніх ускраін». Крэмль – крэпасць для «заходніх ускраін», – так гучаў галоўны лозунг, а «мінімізацыя затрат на іх рэінтэграцыю ў расійскую прастору» станавілася галоўным рычагом прапанаванай стратэгіі.

На фоне такіх пасылак важна адзначыць пэўную эвалюцыю інтэграцыйных сімпатый, якія дэманстравала беларускае грамадства. Паводле вынікаў незалежнага апытання (НІСЭПД) у верасні 2009 г., беларусы на альтэрнатыўнае пытанне «Калі б вам прыйшлося выбіраць паміж аб'яднаннем з Расіяй і ўступленнем у Еўрасаюз, то што б вы выбралі?» упершыню адказалі так: уступленне ў ЕС – 42,3%, аб'яднанне з Расіяй – 42,1%. У сакавіку 2011 г. адказы на аналагічныя пытанні ўжо далі адпаведныя значэнні 50,5% і 31,5%. Гэта сапраўды былі толькі сімпатыі, а геапалітычны настрой апытаных (паводле адказаў на іншыя пытанні) пераканаўча гучаў як «захаванне суверэнітэту беларускай дзяржавы».

**Характар беларуска-расійскага стратэгічнага партнёрства**

У двухбаковых беларуска-расійскіх адносінах стрыжнёвую лінію захоўвала стратэгічнае партнёрства. Шануючы яго прынцыпы, беларуская дыпламатыя працягвала актыўную працу з расійскім бокам, у тым ліку ў кантэксце эканамічнай інтэграцыі, ваеннага супрацоўніцтва, будаўніцтва Саюзнай дзяржавы пры захаванні асноватворных прынцыпаў – раўнапраўя бакоў і гарантый суверэнітэту Беларусі.

Стратэгічнае вымярэнне набылі вынікі супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы: пасля працяглай узаемнай «прыцiркі» ў 2008 г. уступіў у сілу шэраг дакументаў саюзнага фармату: міжурадавае «Пагадненне аб парадку аказання медыцынскай дапамогі грамадзянам Беларусі ва ўстановах аховы здароўя Расіі і грамадзянам Расіі ў адпаведных беларускіх установах», двухбаковае «Пагадненне аб забеспячэнні роўных правоў грамадзян дзвюх краін на свабоду перамяшчэння, выбар месца знаходжання і жыхарства на тэрыторыях дзяржаў – удзельніц Саюзнай дзяржавы». З уступленнем у сілу гэтых пагадненняў увесь пакет роўных правоў беларусаў і расіян у Саюзнай дзяржаве набываў практычны статус.

У кастрычніку 2008 г. у Мінску адбылося пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы. Беларускую дэлегацыю ўзначальваў прэм'ер-міністр С. Сідорскі, расійскую – старшыня ўрада У. Пуцін. Былі разгледжаны актуальныя пытанні беларуска-расійскай інтэграцыі, ахапіўшай гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, арганізацыю працы па ўліку, ацэнцы і кіраванні актывамі Саюзнай дзяржавы, саюзны бюджэтны працэс, рэалі-

зацыю «Асноўных напрамкаў фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы». Удзельнікі пасяджэння разгледзелі ход выканання «Плана мерапрыемстваў па стварэнні адзінай інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы ў галіне сродкаў масавай інфармацыі на 2007–2010 гг.». Выпрацаваная на працягу 2008-га і замацаваная ў пачатку 2009 г. у выглядзе адпаведных рашэнняў на вышэйшым і высокім узроўнях стратэгічная лінія беларускай працы на расійскім напрамку ў асноўным забяспечвала стабільнасць узаемадзеяння, якое ажыццяўлялася з улікам нацыянальных інтарэсаў краіны.

У студзені 2009 г. Беларусь і Расія на пасяджэнні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы падпісалі сумесны антыкрызісны план. Стрыжнем дакумента стала дамоўленасць пра абмен інфармацыяй па прыватызацыі аб’ектаў прамысловасці і ўмацаванні эканамічнай інтэграцыі. Аднак беларуска-расійскае стратэгічнае партнёрства нельга было параўнаць, як, дарэчы, і раней, з ідылічнай згодай і салідарнасцю. Адносіны з Масквой істотна, хоць і палітычна прыглушана, сталі азмрочвацца цесна звязаным з заходнееўрапейскім вектарам Беларусі і «правіслым» пытаннем прызнання ёю незалежнасці Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Згаданая сувязь не толькі была прычынна абумоўленай, але і звязанай па часе; вясной 2009 г. гэта азначала: калі пад націскам Расіі Беларусь не становіцца ўдзельніцай «Усходняга партнёрства», то, прызнаўшы дзве новыя рэспублікі, захоўвае шырокія расійскія фінансава-эканамічныя прэферэнцыі. Калі ж яна далучаецца да «Усходняга партнёрства», то змяняецца да горшага змест расійска-беларускага стратэгічнага партнёрства.

Уступіўшы ва «Усходняе партнёрства», Мінск спрабаваў іграць на два «фронты» з мэтай захаваць спрыяльныя адносіны і з Усходам, і з Захадам. З эканамічнага пункту погляду такая стратэгія цалкам апраўдвалася, паколькі ЕС для Беларусі з’яўляўся другім па важнасці гандлёвым партнёрам пасля Расіі – туды ў 2008 г. было накіравана 44% экспарту і тавараабарот ацэньваўся ў 22 млрд дол. (з Расіяй – 35 млрд). Ясна, што Беларусь была зацікаўлена ў пашырэнні гандлёвых адносін, якім перашкаджаў адмоўны вобраз краіны на Захадзе.

Не было сумнення, што Масква лічыла ўдзел Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» антырасійскім па характары, аднак прамалінейных перашкод да 2010 г. гэтаму працэсу не аказвала. Тым больш яна была здольнай перабіць заходні беларускі вектар уласнымі гандлёва-фінансавымі прэферэнцыямі. Расійская фінансавая дапамога Беларусі як альтэрнатыва «Усходняму партнёрству» пэўны час служыла фактарам стрымлівання беларускіх апетытаў на Захадзе. Аднак ужо ў канцы 2009 г. Масква дала зразумець, што і крэдыты, і льготныя саюзніцкія тарыфы на энерганосьбіты для Беларусі лічыць формай субсідзіравання беларускай эканомікі на палітычнай аснове. Гэтае патрабаванне агучвалася шматлікімі расійскімі аналітыкамі так: «Калі Крэмль дацірує Мінск, то ён мае права патрабаваць адпаведных крокаў у плане палітычнай і эканамічнай інтэграцыі».

Расійскае кіраўніцтва таксама не магло дараваць беларускаму лідару тое, што ён на працягу 2009 г. тройчы сустракаўся з адыходзячым з пасады ўкраінскім прэзідэнтам В. Юшчанкам, па маскоўскай версіі, адыёзнай антырасійскай фігурай; падазравалася, што візіты, траншы МВФ для Беларусі і праславутае «Усходняе партнёрства» маюць цесную сувязь.

Стратэгічнае беларуска-расійскае партнёрства традыцыйна працягвалася ў сферах ваеннага супрацоўніцтва і бяспекі. Менавіта ў гэтым ключы як вызначальны напрамак трэба разглядаць рашэнні 2007–2009 гг. па яго ўмацаванні ў абароннай сферы. У прыватнасці, заключэнне двухбаковых пагадненняў аб сумеснай ахове знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы ў паветранай прасторы і стварэнні Адзінай рэгіянальнай сістэмы супрацьпаветранай абароны (СПА) Расіі і Беларусі. Дакументы паставілі «юрыдычную кропку» ва ўжо існуючым цесным узаемадзеянні бакоў у дадзенай галіне. Аднак пагадненне аб стварэнні Адзінай рэгіянальнай сістэмы СПА беларускі прэзідэнт зацвердзіў

толькі ў лютым 2012 г., або, як пракаменціравала беларуская апазіцыя, «аддаў беларускае неба Расіі». Трэба меркаваць, згаданы крок быў вымушаны. Ён адкладваўся з 1999 г. дзеля атрымання ўзамен больш выгадных эканамічных прэферэнцый ад Расіі. Імі, мабыць, сталі крэдыт на будаўніцтва АЭС і фінансавы крэдыт па лініі ЕўрАзЭС.

У студзені 2012 г. Масква занепакоілася наконт тэрытарыяльнай цэласнасці свайго ўсходняга стратэгічнага партнёра. Генеральны штаб Расіі прыкмеціў пагрозу ваеннай бяспецы сваёй дзяржавы ў тэрытарыяльных прэтэнзіях Польшчы да Беларусі. Расійскія ваенныя палічылі, што Варшава намерана адрэзаць частку Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Падазрэнні былі працягам выказванняў беларускага прэзідэнта, які некалькі месяцаў раней заявіў аб раскрыцці польскага сакрэту, што «заходняя мяжа ў нас павінна пад Мінскам праходзіць». Сцвярджэнне тады выклікала абурэнне і рэзкі дыпламатычны дэмарш Варшавы. Польскае знешнепалітычнае ведамства заявіла, што «прыпісанае польскім уладам жаданне перагледзець дзяржмяжу пазбаўлена ўсялякіх падстаў... Такія заявы з’яўляюцца падбухторшчыцкімі, яны цалкам безадказныя і разлічаны на стварэнне непатрэбных праблем у адносінах паміж суседзямі». Сапраўды, у «Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі» ад 9 лістапада 2010 г. сцвярджалася, што «дзяржаўныя межы Рэспублікі Беларусь не з’яўляюцца прадметам тэрытарыяльных спрэчак і дамаганняў», а «стан пагранічнай бяспекі стабільны». Пазней аналітыкі не ўгледжвалі рэальных фактаў і падстаў для пагаршэння стану пагранічнай бяспекі Беларусі і дапускалі, што вобраз патэнцыяльнага захопніка спатрэбіўся расійскім стратэгам для ўмацавання пачуцця залежнасці і прывязкі Беларусі да свайго ўсходняга стратэгічнага партнёра. На ролю захопніка найлепш падыходзіла Польшча як сумежная з Беларуссю дзяржава, ініцыятар непрымальнага для Масквы «Усходняга партнёрства», найбольш настойлівы «дэмакратызатар» беларускага грамадства і краіна, да якой існуе пэўная негатыўная гістарычная памяць у масавай свядомасці беларусаў.

**Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва**

У гандлёва-эканамічнай сферы прыярытэтным для Беларусі заставаўся расійскі вектар. У цэлым адносіны Беларусі і Расіі, асабліва пасля 2006 г., характарызаваліся высокім узроўнем узаемадзеяння, захаваннем пэўнага ўзаемадаверу, што дазволіла выйсці на вырашэнне шэрагу важных эканоміка-фінансавых і гаспадарчых пытанняў.

Толькі ў 2008 г. было праведзена пяць сустрэч на вышэйшым узроўні, якія пацвердзілі пераемнасць расійскага курсу на будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. З расійскім кіраўніцтвам (прэзідэнт Д. Мядзведзеў) былі ўстаноўлены актыўныя кантакты ў гаспадарча-эканамічнай сферы, замацаваны раней напрацаваныя сувязі. Асаблівая ўвага надавалася ўтрыманню дасягнутых у гандлі з Расіяй вынікаў, пашырэнню кааперацыі, прыцягненню інвестыцый, пошуку дадатковых магчымасцей пашырэння геаграфіі паставак, фарміраванню тавараправодзячай сеткі, рашэнню шэрагу іншых знешнеэканамічных задач з улікам новых рэалій і неабходнасці мінімізаваць наступствы сусветнага фінансавага крызісу 2008–2009 гг. для працы беларускіх экспарцёраў на расійскім рынку.

Ва ўмовах крызісу ўзрастала актуальнасць прамых сувязяў паміж беларускімі і расійскімі рэгіёнамі. Рэалізацыя згаданай задачы ішла шляхам інтэнсіфікацыі міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, росту колькасці сумесных знешнеэканамічных здзелак як у Беларусі, так і ў Расіі. У 2008 г. такімі мерапрыемствамі было ахоплена больш за 50 суб’ектаў Расійскай Федэрацыі, хоць пазней іх колькасць паменшылася.

Узгадненне намаганняў, накіраваных на прагматычнае выкарыстанне традыцыйных гандлёва-эканамічных і кааперацыйных сувязяў дзвюх краін, працяглы час дазваляла пазбягаць у двухбаковым дыялогу ўзаемных прэтэнзій, прадаўжаць устойлівы алгарытм канструктыўнага ўзаемадзеяння. Аднак у 2008 г. афіцыйны Мінск насцярожана ўспрыняў прапанову Масквы ажыццяўляць роўны доступ бакоў да дзяржзакупак. Несу-

вымерна большы аб'ём фінансавага капіталу з расійскага боку мог прывесці беларускіх пастаўшчыкоў да стратэгічнага пройгрышу расійскім на рынку дзяржзакупак.

З году ў год удавалася захаваць станоўчую дынаміку беларуска-расійскага тавара-абароту, які ў 2008 г. дасягнуў рэкорднай планкі (34,2 млрд дол. ЗША) і ў параўнанні з 2007 г. вырас на 31,1% (на 8,1 млрд дол.). Беларускі экспарт у Расію склаў 10,6 млрд дол. (рост на 19,2%). На жаль, двухбаковы гандаль заставаўся незбалансаваным; па выніках 2008 г. адмоўнае сальда склалася ў памеры 13 млрд дол. Яго павелічэнне на 4,7 млрд дол. абумоўлівалася значным ростам цэн на расійскія энерганосьбіты і вуглевадародную сыравіну.

Па ініцыятыве Мінска была выпрацавана стратэгія выкарыстання мер агульна-эканамічнага характару, накіраваная на захаванне станоўчых тэндэнцый развіцця ўзаемнага гандлю ў перыяд сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Яе ключавым элементам стаў План сумесных дзеянняў урадаў дзвюх краін па мінімізацыі наступстваў крызісу, паляпшэнні параметраў плацежнага балансу, удасканаленні ўмоў вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці і ўзаемнага гандлю. План быў зацверджаны Вышэйшым Дзяржсаветам Саюзнай дзяржавы (3.02.2009, Масква).

Аднак разблакіраваць механізмы тармажэння ў 2009 г. не ўдалося. Больш за тое, у чэрвені ўспыхнула так званая беларуска-расійская «малочная вайна». Тады Расспажыўнагляд забараніў увоз у Расію беларускай малочнай прадукцыі, што пагражала бюджэту Беларусі стратай прыкладна 1 млрд дол. Беларускі прэзідэнт у гэтых умовах папярэдзіў, што пад пагрозай знаходзіцца ваеннае супрацоўніцтва паміж Масквой і Мінскам. Зачэпкай для санкцый, па сцвярджэнні Масквы, стала тое, што Беларусь не перааформіла дазвольную дакументацыю ў адпаведнасці з новым расійскім тэхнічным рэгламентам, які размежаваў паняцці «пітное малако» і «напоі, адноўленыя з парашковага малака». Амаль 500 відаў малочнай прадукцыі беларускіх вытворцаў страцілі права экспартнай рэалізацыі ў Расіі. Толькі праз некалькі тыдняў бакам удалося ўзгадніць паэтапны парадак афармлення новай дакументацыі і паставак беларускай малочнай прадукцыі.

Сіметрычным адказам Мінска на расійскія абмежаванні стаў узмоцнены рэжым кантролю за перамяшчэннем грузаў на асноўных беларуска-расійскіх магістралях і патрабаванне аплачваць расійскі газ не па стаўках, заяўленых «Газпрамам», а паводле ўзгодненай раней прэзідэнтамі дзвюх дзяржаў сярэднегадавой цане ў 150 дол. за 1 тыс. м³ газу. Толькі пад канец чэрвеня полымя «малочнай вайны», узмоцненай «газавай вайной», стала пакрысе змяншацца; аднак яна нанесла бакам немалы ўрон. Беларусь, з улікам сувымернасці тэрыторый і аб'ёмаў эканамічнага патэнцыялу, пацярпела значна больш. Адгалоскі згаданых «войн», а таксама праблемы з іншымі таварнымі групамі беларускага экспарту ў Расію, транзіту расійскіх энерганосьбітаў праз Беларусь гучалі літаральна да позняй восені 2009 г.

Тым не менш у 2009 г. Расія традыцыйна заставалася асноўным гандлёвым партнёрам Беларусі, склаўшы 47,3% усяго яе знешнегандлёвага абароту. Аднак беларускі экспарт у Расію за 11 месяцаў 2009 г. упаў на 39,5%, дасягнуўшы толькі 6,39 млрд дол., а імпарт склаў 14,98 млрд дол.

Яшчэ ў 2006 г. Беларусь пасля шматгадовых спрэчак згадзілася на продаж расійскаму «Газпраму» 50% Белтрансгаза, роўнымі часткамі па 12,5% на працягу чатырох гадоў з коштам кожнага пакета 625 млн дол. у абмен на захаванне льготных коштаў на газ. Тры пакеты «Газпрам» набыў адпаведна ў 2006, 2007 і 2009 гадах. Сярэдні кошт газу на 2009 г. расійскі бок вызначаў у межах 150 дол. за 1 тыс. м³.

Нягледзячы на такія саступкі, энергетычныя адносіны Беларусі і Расіі на працягу шэрагу гадоў заставаліся выключна канфліктнымі. Канфлікты правакаваліся не толькі нафтавым фактарам, але і павелічэннем коштаў на расійскі газ. Расійскія групы інтарэсаў імкнуліся атрымаць кантроль над новымі беларускімі энергетычнымі аб'ектамі – нафта-

газавымі і электраэнергетычнымі. Прычым з 2012 г. транзіт нафты праз Беларусь пагражаў цалкам спыніцца. Гэта абумоўлівалася імкненнем Расіі забяспечыць уласную транзітную бяспеку, дзеля чаго ў абход Беларусі і Украіны будаваліся трубаправоды БТС-2 і «Паўночная плынь».

Нездаровае саперніцтва (барацьба на выжыванне) намецілася ў ядзернай энергетыцы. На пачатку 2010 г. пад Калінінградам расіяне заклалі Балтыйскую АЭС. Пры ўмове збудавання новай АЭС у Літве і Беларусі на перспектыву патэнцыяльна ствараліся агромністыя лішкі энергіі на адносна невялікай тэрыторыі. Тут дастаткова адной АЭС. Па меркаванні расійскіх аналітыкаў, у гэтай гонцы беларускі бок яўна прайграе. Закладка Балтыйскай АЭС і пачатак укладкі падводнага ўчастка газаправода «Паўночная плынь» сведчылі аб тым, што ў беларускага кіраўніцтва звужалася поле знешнеэканамічнага і энергатранзітнага манеўру.

Адначасова многія эканамічныя эксперты прыходзілі да высновы, што аслабленне беларускай пазіцыі ў энергетычнай сферы мела і пазітыўныя моманты. У Беларусі знікала магчымасць атрымліваць нафтавую рэнту з расійскіх льготных нафтавых паставак, і гэта павінна было стаць дадатко-вым стымулам правядзення эканамічных рэформ.

Распачатая з 2010 г. своеасаблівая тактыка блакіроўкі знешнеэканамічных механізмаў Беларусі і акцэнты задавальнення з вуснаў расійскіх палітыкаў ад яе прымянення сведчылі аб фактычнай адмове стратэгічнага саюзніка ўзгадняць і ўлічваць асаблівасці беларускага экспартнага патэнцыялу.

**Расійскі ўплыў на валютна-фінансавы крызіс 2011 г. у Беларусі**

Фактычна ўвесь 2011 г. у Беларусі прайшоў пад знакам пераадолення фінансавых цяжкасцей. Па меркаванні спецыялістаў МВФ, кіраўніцтва краіны на працягу 2010 г. праводзіла занадта «мяккую» эканамічную палітыку, яе сутнасцю сталі высокія тэмпы крэдытавання экономікі і прадпрынятая ў канцы года папулісцкая мера – значнае павышэнне зарплат.

На павышэнне зарплат экономіка адказала хуткай інфляцыяй па ўсіх франтах. Таму ўжо ў сакавіку 2011 г. Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Moody's Investors Service знізіла суверэнны рэйтынг Беларусі на адну ступень, з «B1» да «B2», з негатыўным прагнозам з-за растучых праблем з атрыманнем знешняга фінансавання. Зніжэнне рэйтынгу агенцтва тлумачыла высокім дэфіцытам плацежнага балансу, дасягнуўшага 16% ВУП. У пачатку красавіка МВФ прапанаваў адзіна эфектыўную меру аздараўлення эканомікі і фінансавай сферы Беларусі – дэвальвацыю рубля не менш, чым на 15%.

Працяглы час беларускія ўлады, найперш Нацыянальны банк, з такой прапановай МВФ не пагаджаліся. Хуткім і выніковым выхадам з сітуацыі лічылася атрыманне знешніх крэдытаў. Крокі па лібералізацыі экономікі мінімізаваліся. Як паказаў час, такая тактыка прывяла да валютна-фінансавага крызісу.

Супраць курса ўрада шукаць знешнія крэдыты на падтрыманне плацежаздольнасці рубля і бягучыя патрэбы выступалі шэраг эканамістаў і апазіцыйныя сілы.

Нечакана для Мінска і Расія, галоўны стратэгічны партнёр, абумовіла выдзяленне крэдыту папярэднім прадастаўленнем праграмы дзеянняў беларускага ўрада па прыватызацыі, якая «павялічыць долю прыватнага сектара экономікі краіны». Прадстаўнікі расійскага ўрада выказваліся супраць выдачы крэдыту Беларусі, паколькі, «маючы неэфектыўную экономіку, яна не зможа яго вярнуць». У маі было адмоўлена ў крэдыце з расійскага бюджэту, надзея засталася толькі на Антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС: 3 млрд дол. ЗША – па 1 млрд штогод у 2011–2013 гг. на макраэканамічную стабілізацыю і пакрыццё дэфіцыту плацежнага балансу. Пры гэтым расійскі ўрад, галоўны донар фонда, запатрабаваў укласці ў праграму 7,5 млрд дол. прыватызацыйных актываў. Аналітыкі адразу ўгледзелі ў гэтым разлік расійскіх манапалістычных колаў атрымаць на тры гады гаран-

тыю прыватызацыі значнай часткі прывабных беларускіх магутнасцей. Выдзяленне і гэтага крэдыту амаль дэманстратыўна зацягвалася. Расійскі пасол у Мінску А. Сурыкаў у канцы красавіка прапанаваў перагаворы па ўвядзенні на тэрыторыі Беларусі расійскага рубля.

Фінансавы свет, уключаючы МВФ, заняў вычакальную пазіцыю. Раней, у 2009–2010 гг., нягледзячы на сусветны эканамічны крызіс, МВФ прадаставіў Беларусі крэдыт на 3,6 млрд дол. Зараз жа «зачыніў дзверы», заявіўшы аб адсутнасці крокаў з боку беларускіх уладаў па ўмацаванні фінансава-эканамічнай сферы, у прыватнасці – адсутнасці структурных рэформ і карэкціроўкі макраэканамічнай палітыкі. Насуперак гэтым рэкамендацыям урад рабіў асноўны акцэнт на рост экспарту як сродак кампенсацыі плацежнага дэфіцыту. Праўда, прадстаўнікі Еўрасаюза, адсочваючы фінансавыя цяжкасці Беларусі, прыкладна з канца лютага шматразова рабілі заявы аб гатоўнасці працягваць супрацоўніцтва з афіцыйным Мінскам па фінансава-эканамічных праблемах, нягледзячы на пагаршэнне адносін пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. Аднак для аднаўлення дыялогу ставіліся безальтэрнатыўныя палітычныя ўмовы.

Тым часам толькі за студзень–красавік 2011 г. адмоўнае сальда знешняга гандлю дасягнула больш за 3,7 млрд дол., перавысіўшы на 85% адпаведны паказчык мінулага года. Плацячы абясцэненымі рублямі, усе беларускія пакупнікі неслі нашмат большыя выдаткі па імпарце. Прадпрыемствы не маглі купіць валюту для працягу сваёй працы. Апазіцыйныя сілы сталі сцвярджаць, што эканамічная палітыка паставіла пытанне аб далейшым існаванні краіны ў якасці незалежнай суверэннай дзяржавы.

Толькі ў канцы мая кіраўніцтва Беларусі адкрыта прызнала, што прычына валютнага крызісу – празмерная грашовая эмісія, а праз яе, «накачка» эканомікі і насельніцтва пустой грашовай масай. Прызнанне адкрыла шлях да радыкалізацыі аздараўленчых мер, хоць праграма аздараўлення валютна-фінансавай сферы не была абнародавана. 23 мая і 14 верасня прайшлі дзве дэвальвацыі рубля адносна долара, еўра і расійскага рубля. Яны прыпынілі інфляцыю і пэўным чынам стабілізавалі пакупніцкую здольнасць нацыянальнай валюты. Праўда, у выніку дэвальвацый курс рубля знізіўся на 108,7. Майская дэвальвацыя аказалася сусветным рэкордам апошніх 20 год, перавысіўшы эфіопскую 1992 і аргенцінскую 2002 гг.

Улады прадпрымалі забаронныя меры. Яны датычыліся найперш некантраляванага адтоку будаўнічых і іншых высокапрафесійных спецыялістаў за мяжу. Таксама пры асабістым вывазе за мяжу на продаж аўтамабільнага паліва і іншых сацыяльна значных тавараў устанаўліваліся пошліны і зборы.

Антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС прыняў рашэнне выдзеліць Беларусі ў 2011–2013 гг. крэдыт у 3,0 млрд дол. Яго першыя траншы памерам 0,88 млрд выплачваліся летам і восенню. На люты 2012 г. планаваўся (аднак затрымліваўся) трэці транш у 440 млн дол.

У пачатку 2012 г. ва ўмовах адноснага паляпшэння фінансава-эканамічнай сітуацыі ў краіне знешнія фактары ўплыву на яе не зменшыліся. Напрыклад, падпісаўшы пагадненне аб крэдыце Антыкрызіснага фонда ЕўрАзЭС, Беларусь абавязалася штогод прадаваць дзяржмаёмасць на суму 2,5 млрд дол. Па меркаванні некаторых беларускіх аналітыкаў, куплю ўласнасці гарантавала сабе «алігархічная Расія». Продаж расійскаму «Газпраму» ў снежні 2011 г. 50% маёмасці «Белтрансгаза» яны ацэньвалі як паскарэнне васалізацыі Беларусі. Нават з улікам дыскусійнасці падобных ацэнак было зразумела, што ад прадуманых знешнепалітычных крокаў у значнай ступені залежала выкананне знакавых агульнадзяржаўных праектаў. Упэўненасці ў іх рэалізацыі не было.

А ў цэлым стабілізацыя валютна-фінансавай сферы праходзіла нетаропка. Сукупны аб'ём знешняга доўгу краіны на 1.01.2012 перавысіў 34 млрд дол., або 62,3% ад ВУП, пры тым што раней улады вызначылі максімальнае значэнне гэтага паказчыка на ўзроўні 55% ад ВУП. За 2011 г. ён вырас на 19,8%, а за 2007–2011 гг. Павялічыўся ў 21 раз. Узрастала даўгавая нагрузка на краіну: калі ў 2011 г. на пагашэнне і абслугоўванне знеш-

няга доўгу пайшло 628,9 млн дол., то ў наступным ужо патрабавалася 1,78 млрд, а ў 2013 і 2014 гг. – звыш 3 млрд дол. штогод.

Новая прапанова расійскай дыпламатыі ў студзені 2012 г. аб заключэнні манетарнай уніі не дадавала аптымізму. Такі крок азначаў канчатковую прывязку Беларусі да Расіі ў эканамічным, фінансавым, палітычным, ваенна-стратэгічным плане і відавочнае абмежаванне дзяржаўнага суверэнітэту. МВФ прадаўжаў вывучаць магчымасць выдзялення крэдыту і абумоўліваў яго «пераканаўчымі крокамі ўрада ў эканамічнай палітыцы», патрабуючы знізіць удзел дзяржавы ў эканоміцы і павялічыць долю прыватнага сектара, каб тым самым павысіць яе эфектыўнасць. Таму эксперты ацэньвалі сітуацыю як дастаткова трывожную. Небяспеку ўяўляў не столькі памер знешняга доўгу, колькі адсутнасць структурных рэформ у эканоміцы. Без іх пагражала скатванне ў даўгавую яму.

Такім чынам, двухбаковая беларуска-расійская інтэграцыя ў пачатку XXI ст. перажывала малапрыкметную эвалюцыю, характэрнай рысай якой станавіліся намеры і практычныя крокі расійскага партнёра па замацаванні эканоміка-палітычнай залежнасці Рэспублікі Беларусь. Вырысоўвалася глабальная мэта Крамля – цвёрдымі эканоміка-палітычнымі мерамі ўтрымліваць Беларусь на расійскай геапалітычнай арбіце, цалкам выключаючы яе разварот на Захад.

Эканамічную сітуацыю ў прынцыпе магло аздаравіць толькі прыцягненне замежных інвестыцый, прычым заходніх інвестыцый, здольных укараніць сучасныя тэхналогіі і мадэрнізаваць транспартнае машынабудаванне, станкабудаванне, іншыя галіны, што выпускаюць складаную тэхнічную прадукцыю. У цэлым валютна-фінансавы крызіс 2011 г. падвёў рысу пад мінулай беларускай эканамічнай мадэллю як недастаткова эфектыўнай. Былыя крыніцы росту аказаліся вычарпаны. Такая сітуацыя патрабавала штуршка для пошуку шляхоў абнаўлення мадэлі эканамічнага развіцця.

Увогуле, у 2009 – пачатку 2012 гг. беларуска-расійская інтэграцыя і стратэгічнае партнёрства перажывалі выпрабаванне як рэальнасць і ілюзіі. Інтэграцыі часам навязваліся лімітрофныя рысы. Гэта абмяжоўвала рух геапалітычнага маятніка толькі ад намаганняў беларускага кіраўніцтва. Узросшая ад Расіі крэдытная залежнасць, продаж часткі важных вытворчых актываў, запазненне з рэфармаваннем эканомікі – усе гэтыя фактары паступова абмяжоўвалі геапалітычныя опцыі афіцыйнага Мінска. Паводле выказвання расійскага палітолага А. Суздальцава, для Беларусі наступіў час вялікай геапалітычнай мітусні. Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. маятнік зусім затрымаўся ва ўсходнім пункце амплітуды. Гэта ўяўляла небяспеку для беларускай дзяржавы, паколькі роля яго запуску на поўную магутнасць належала Расіі або Захаду.

***Chesnovski M.E.*** **Peculiarities of Belarusian-Russian Integration at the Beginning of the XXI Century**

During ten years and a half after the Presidential election in 1994, which marked a new style of leadership, vital Belarusian foreign accents were formed and changed like geopolitical pendulum At the moment favourable to Minsk it deviated either to the East (Russian priority) or to the West- the side of the European Union (EU). Such maneuverability enabled the state to keep up the sovereignty and achieve its interests in economy and foreign policy. Transit geographical position of Belarus helped continuous work of the pendulum which one way or other was «nourished» by the interests of most Western countries and partners within Eurasian expanses related to it. At the same time for country members of the Commonwealth of Independent States (CIS) Belarus got the pattern status in the process of wide integration with the Russian Federation. The change of integration strategy of Russia which a new leader started to implement at the beginning of 2000 gradually led to definite limiting of independence of the Republic of Belarus and self-reliance of Belarusian leadership in foreign policy realization. At the same time there appeared the varieties of Belarusian-Russian integration in two and many-side size as the variants of integration of different speed on the territory of CIS.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 04.10.2012